В. С. Варапаева Т. С. Куцанава

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

# 2

Частка 1



**В. С. Варапаева Т. С. Куцанава**

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 1

2-е выданне, дапоўненае

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

**Мінск «Народная асвета» 2010**

Правообладатель Народная асвета

УДК 821.161.3.09(075.2)-056.313
ББК 83.3(4Бел)я721.7
В18

Рэцэнзент:

кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры *Л. М. Гамеза*)

**Умоўныя абазначэнні**:

— чытае настаўнік

— дадатковае чытанне

— тлумачыць настаўнік

?! — пытанні і заданні

— слоўнік

✻ — дыферэнцыраванае заданне

**Варапаева, В. С.**

В18 Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 2-га кл. спец. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / В. С. Варапаева, Т. С. Куцанава. — 2-е выд., дапоўненае. — Мінск : Нар. асвета, 2010. — 103 с. : іл.

ISBN 978-985-03-1272-3.

Вучэбны дапаможнік для 2-га класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні.

**УДК 821.161.3.09(075.2)-056.313**
**ББК 83.3(4Бел)я721.7**

**ISBN 978-985-03-1272-3 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-03-1271-6**

© Варапаева В. С, Куцанава Т. С., 2000
© Варапаева В. С, Куцанава Т. С., 2010, са зьмяненнямі
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2010

Правообладатель Народная асвета

## Незаменнае

Мір,
Радзіма,
мама —
усяму аснова.
Мір,
Радзіма,
мама —
нам святыя словы.
Замяніць і страціць
нельга, немагчыма
першыя паняцці:
мама,
мір,
Радзіма.

*Васіль Жуковіч*

**1.** Чаму слова *мама* — дарагое слова?
**2.** Для чаго нам патрэбны мір?
**3.** Як вы разумееце слова *Радзіма*?



Правообладатель Народная асвета



# З ВУСНАЎ У ВУСНЫ

## Калыханкі

**Калыханка — напеўная, спакойная песенька, якую спяваюць малым, каб яны хутчэй заснулі.**

**Чытай правільна:** ува-хó-дзіць, кра-дзéц-ца, дзі́ў-най.

### Калыханка

Ціха ўночы за акном.
Уваходзіць сон у дом.
Ён крадзецца з ціхай
ласкай,
з нейкай дзіўнай
добрай казкай.
Баю-бай.

✻ Знайдзі словы, якія маюць адзін склад.


Правообладатель Народная асвета

**Чытай правільна:** спі́ц-ца, пра-спа́ць, ба-і́ц-ца, дзі-ця́т-ка, пе́-сень-ку, ні́-тач-ку.

**Чытай калыханкі напеўна, нібы спяваеш.**

## Пеўнік

Люлі-люлі-люлі,
курачкі паснулі.
Толькі пеўніку не спіцца:
ранак ён праспаць баіцца.

## Люлі-люлі, люляшу

Люлі-люлі, люляшу,
я дзіцятка калышу,
нітачку звіваю,
песеньку спяваю.

**1.** Калі спяваюць калыханкі? Хто можа спяваць калыханку? Знайдзі правільны адказ: *маці*, *бабуля*, *пеўнік*, *радыё*, *кот*.
**2.** Праспявай калыханку.

## Складзі два словы

| | | |
|---|---|---|
| **спя** | | |
| | **ва** | **ю** |
| **зві** | | |

Правообладатель Народная асвета

# Забаўлянкі



**Забаўлянкі — вясёлыя і смешныя вершы.**

**Чытай правільна:** пры́-каз-ка, упо́-цем-ку, гар-шкі́, скле́й-ваць.

## Прыказка пра коціка, які гаршкі пабіў упоцемку

— Коцік-каточак, дзе ўночы быў?
— У каморы малако піў.
— А куды цяпер бяжыш?
— Гаршкі склейваць...

*Іван Бурсаў*

?!

**1.** Прачытай словы, якія заканчваюцца на літару **ў**.
**2.** Знайдзі і прачытай сказы-пытанні.
**3.** Знайдзі і прачытай сказы-адказы.

* * *

— А чаму ты чорны, кот?
— Лазіў ноччу ў дымаход.
— А чаму ты пабялеў?
— З гладыша смятану еў.

*Уладзімір Бабкоў*

**Чытай правільна:** па-ла-са́-ты кот, на гра-дзе́, па-ла́-шчыў-ся шча-ко́й, ро́-дзіч мой.


Правообладатель Народная асвета

## Родзічы

Паласаты кот
бяжыць,
на градзе гарбуз
ляжыць.
Кот палашчыўся
шчакой:
— Міленькі
ты родзіч мой!
У цябе, як і ў мяне,
шмат палосак на спіне.

*Віталь Гардзей*



?!

**1.** Па якіх прыметах кот вызначыў свайго родзіча? Знайдзі і прачытай.

**2.** Прачытай словы, з якімі кот звяртаецца да гарбуза.

**3.** Хто родзічы: *гарбуз*, *кот*, *дыня*, *гурок*? Чаму?

**4.** Запомні: **род — радня — родзіч**.

**5.** Знайдзі ў вершах словы з гукам **[г]**. Вымаўляй правільна гэты гук.

## Коця і Каця

Плача коця на кухні,
ад слёз вочкі папухлі.
— Што з табою, мой каток,
забалеў мо жыватак?

Правообладатель Народная асвета



— Мяў! — сказаў варкоцік. —
Не баліць жывоцік.
У мяне душа баліць —
як цяпер на свеце жыць,
як мне жыць у хаце,
калі хлусіць Каця:
смятану злізала —
на мяне сказала.

*Васіль Вітка*

?!

**1.** Хто з герояў табе спадабаўся? А хто не? Чаму?

**2.** Як аўтар называе коціка? Як ты разумееш слова *варкоцік*?

**3.** Якія словы падыходзяць да ката: *ка-ця-ня, ка-то-чак, хлу-сіць, вар-ко-цік, Ка-ця, ко́-ця*?

**4.** Каго ты бачыш на малюнку?

**5.** Чаму маці здзівілася?

**6.** Што робіць кот? Чаму?

### Параўнай словы

Каця — коця

Чаму тут *Каця* напісана з вялікай літары, а *коця* — з малой?



Правообладатель Народная асвета

## Назаві правільна





Хто гэта? Што гэта?

Падумай, якая адна назва можа падысці да кожнага малюнка.

**Чытай правільна:** ку-ра-ня́-ты, хо́-дзяць з ку́-рач-кай чу-ба́-тай, будзь ува́ж-най.

### Будзь уважнай

Каля плота кураняты
ходзяць з курачкай чубатай.
Будзь уважнай, курка, —
на акенцы Мурка.

*Ніна Галіноўская*

Правообладатель Народная асвета

**1.** Хто такая Мурка?

**2.** Якое слова можна скласці з літар **к**, **а**, **М**, **р**, **у**? Гэта слова ёсць у вершы. Чаму яно пішацца з вялікай літары?

**3.** Якое слова ёсць у вершы: зяр-няты; кура-...?

**Чытай правільна:** кве́т-ка пра-чы-на́-ец-ца, ро́-са-мі ўмы-ва́-ец-ца, мы́-ем-ся ва-дзі́ч-каю, ся-стры́-чкаю.

## Коцік прачынаецца

Коцік прачынаецца —
лапкай умываецца.
Кветка прачынаецца —
росамі ўмываецца.
Ну а мы з сястрычкаю
мыемся вадзічкаю.

**1.** Хто чым умываецца? Выправі памылку.

Коцік — росамі.
Кветка — рукамі.
Дзеці — лапкамі.

**2.** Што табе неабходна для ўмывання: *ручнік, мыла, мачалка, вада, шчотка*?

**3.** Ці ёсць у цябе коцік? Як яго завуць? Які ён? Раскажы пра яго.


Правообладатель Народная асвета

## Чытай

**МАК** — *мак*

**РАК** — *рак*

**ЛАК** — *лак*

Чым адрозніваюцца гэтыя словы?

**Чытай правільна:** Ю́зік пы-та́-ец-ца, аку-ля́-ры, па-вя-лі́ч-ва-юць.

## Малы ласун

Падчас вячэры малы Юзік пытаецца ў бабулі, чаму яна носіць акуляры.

— Бо яны, унучак, павялічваюць прадметы.

— Ой, бабуля, калі будзеш адразаць мне пірага, здымі акуляры.

Ласу́н — той, хто любіць паесці што-небудзь смачнае, салодкае.

**1.** Як ты зразумеў просьбу Юзіка?
**2.** Чаму Юзіка назвалі ласуном?
**3.** А як яшчэ можна назваць хлопчыка? Знайдзі правільны адказ: *баязлівы, знаходлівы, хітрун*.

**Чытай правільна:** хо́-лад-на, адзе́н-не.

Правообладатель Народная асвета

## Што надзенем?

Прыйшла зіма. Стала холадна. Мама пытаецца ў Яны:

— Якое адзенне трэба ўзяць з шафы?



Дапамажы Яне.

Прачытай словы, якія пачынаюцца са склада ***ша***.

| | | |
|---|---|---|
| ша́шкі | шы́шка | ша́пка |
| ша́хматы | шы́ла | ша́фа |
| шы́на | шала́ш | |



Правообладатель Народная асвета

## Беларускія народныя песні

**Чытай правільна:** ха-джу́, бя-рэ́з-ніч-ку, за-ма-чы́-ла-ся, ура-сі́-ла-ся, буй-не́нь-кі.

### Па бары хаджу

Па бары хаджу,
па бярэзнічку.
Ой, люлі-люлі,
па бярэзнічку.
Бяру ягадкі
буйны, салодкі.
Замачылася,
урасілася.
А ты, **сонейка**,
а ты, **жаркае**,
**абагрэй** ты мяне!
А ты, **ветрычак**,
а ты, **буйненькі**,
**абсушы** ж ты мяне!

Бярэ́знічак (бярэ́знік) — бярозавы лес.

**1.** Знайдзі і прачытай, што ў песні гаворыцца пра ягады.

**2.** Якімі словамі апісана *сонейка*, *ветрычак*?

**3.** *Сонейка жаркае*. А якое яшчэ можа быць сонца?

Правообладатель Народная асвета

**4.** *Ветрычак буйненькі*. А які яшчэ бывае вецер?

**5.** Растлумач словы: *замачылася, урасілася*.

**6.** Падзялі выдзеленыя словы на склады.

**7.** Размясці словы ў пэўным парадку:
*Вечар. Ранак. Дзень. Поўдзень. Ноч.*



**Словы, якія ласкава называюць прадметы, — гэта словы з памяншальна-ласкальным значэннем.** Напрыклад, *сонейка*, *ветрычак*, *ягадкі*, *песенька*.

**Чытай правільна:** раз-ві-та́-ем-ся, зі́-мач-ку, ха-ло́д-ную, са-со́н-ні-кі, жыт-нё-вае, шаў-ко́-выя, вы́-ку-па-ны.



## Бяроза з лістком



Бяроза з лістком,
белая з лістком,
усю восень шумела.
— Бярозка мая,
белая мая,
як мы з табой
развітаемся?
— Лісточак ты мой,
зялёненькі ты мой,
так жа мы развітаемся:





Правообладатель Народная асвета

ветрычак павее,
цябе пакоціць,
а я буду стаяць,
праз зімачку халодную,
стоячы, цябе чакаць.

?!

**1.** Прачытай спачатку словы, якія гаворыць лісточак, а затым — словы бярозы.

**2.** Перачытай песню. Знайдзі словы з памяншальна-ласкальным значэннем.

## Асвяці і абагрэй



Сонейка,
сонейка,
асвяці
сасонікі,
полейка жытнёвае
і лугі шаўковыя...
Дай цяпла нам
трошкі,
абагрэй нам
ножкі.
Ножкі нашы
босыя
выкупаны
росамі.

Правообладатель Народная асвета

?!

**1.** Чаму ў песні выкарыстана слова *сонейка*, а не *сонца*?

**2.** Як ты разумееш выраз *лугі шаўковыя*?

**3.** Прачытай песні яшчэ раз.

**4.** Якая з песень табе больш спадабалася? Чаму?

**5.** Знайдзі словы ў песні, якія надаюць ёй напеўнасць.

**6.** Якім словам можна падпісаць малюнак: *соль, сонца, сасна?*

**Звярні ўвагу!** У песнях ёсць паўторы і словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Яны надаюць песні напеўнасць.

## Прыказкі

**Прыказкі — мудрыя словы.**

Прачытай прыказкі і растлумач іх.

Адзін раз зманіш — другі раз не павераць.
За сем работ бярэцца, а ні адна не ўдаецца.
Не бяры чужога і не бойся нікога.

## Лічылкі

**Чытай правільна:** гра́-ма-це, мы́ш-ка-мі, па-гу-ля́ць, вы́й-шаў, ска-ка́ць, пла-ці́-лі.


Правообладатель Народная асвета

* * *

Раз, два, тры, чатыры,
кошку грамаце вучылі:
не чытаць, не пісаць,
а за мышкамі скакаць.

* * *

Аты-баты — ішлі салдаты.
Аты-баты — на базар.
Аты-баты — што купілі?
Аты-баты — самавар.
Аты-баты — што плацілі?
Аты-баты — тры рублі.

**Чытай правільна:** на-та-пы́-рыў, сха-ва́-ем-ся, шчоўк, воўк.

* * *

Раз, два, тры, чатыры,
зайчык вушы натапырыў.
Ідзе з лесу воўк, воўк
і зубамі шчоўк, шчоўк.
Мы схаваемся ў кусты:
зайка, я, і ты, і ты.
Ты ж,ваўчына, пачакай,
як схаваемся — шукай.

*Васіль Вітка*

?! **1.** Знайдзі словы з літарай **ў** і прачытай.
**2.** Складзі словы з літар: з й а а к, в ў к о.

Правообладатель Народная асвета

**3.** Прачытай словы з памяншальна-ласкальным значэннем.

**4.** Вывучы адну з лічылак на памяць. Выкарыстоўвай лічылкі ў сваіх гульнях.

## Загадкі

**Чытай правільна:** людзь-мí, аба-рáн-кам, кіп-цю-ры́, ка-мéнь-чы-кі, ку-пá-ец-ца.

З людзьмі сябруе,
хату вартуе,
жыве пад ганкам,
хвост абаранкам.





**Маленькія** лапкі,
на лапках драпкі,
**ціхенька** ступае,
мышак пужае.

Ходзіць па двары,
на нагах кіпцюры,
белыя **каменьчыкі** нясе.





Белая як снег,
цэлы дзень у рэчцы купаецца,
а на бераг выйдзе — сухая.



Правообладатель Народная асвета

Не **будзільнік**, а праспаць
гаспадыні ён не дасць.
**Прапяе** шмат разоў:
— Пад’ём! —
І ўвесь **разбудзіць** дом.



?! **1.** Прачытай уважліва кожную загадку.
**2.** Знайдзі адгадкі на малюнках.
**3.** Якія словы ў загадцы дапамаглі адгадаць яе?
**4.** Падзялі выдзеленыя словы на склады.
**5.** Вывучы загадку, якая спадабалася, на памяць. Загадай загадкі сваім сябрам.

## Загадкі

Рук, ног не мае,
а вароты адкрывае. (*Веце_*)

Без фарбы, без алоўка
малюе хутка, лоўка. (*Мар_з*)

Устаў прапушчаныя літары.

**Чытай правільна:** сас-нó-вым, птý-шач-ка.

У сасновым ляску чутна сумнае: — Ку-ку!
А ці ведаеш, якая гэта птушачка кувае?

Дай назву вершу.
А як спяваюць певень, варона, верабей?

Правообладатель Народная асвета

## Параўнай словы

бетон — батон — бутон

?!

**1.** Што абазначаюць гэтыя словы?
**2.** Чым яны адрозніваюцца?

## Як зваць дзяцей?







ця

Ві Ка

Мі

## Падумай — адкажы

Несла гаспадыня ў кошыку дзесяць яек, **а дно** ўпала. Колькі яек засталося?

Прачытай задачку. Заўваж, як напісаны выдзеленыя словы. Яны падкажуць адказ.

## Загадка

Не пытайся ў мамы —
сам гавары:
хто бегае над намі
нагамі дагары?

Знайдзі адгадку (*кот*, *муха*, *сабака*).


Правообладатель Народная асвета

**1.** Чым адрозніваюцца словы *за́мак — замо́к*? Складзі сказ з кожным словам.

**2.** Прыдумай словы, якія пачынаюцца са склада ***ма*** па ўзоры: **ма**шына, **ма**лы, **ма**кароны ... .

**Чытай правільна:** упер-шы-ню́, чыр-во́-ныя, пун-со́-выя, па́-мя-та-ла.

## Што за ягады?

Алёнка ўпершыню збірала з бабуляй ягады ў лесе. Яны былі чырвоныя, пунсовыя з белымі бачкамі і чорныя. Набралі цэлы кошык, а назвы ягад Алёнка забылася. Памятала толькі, што ў канцы кожнай назвы гучыць **іцы**.

Дапамажы ёй!



Знайдзі па апісанні ў тэксце *суніцы, брусніцы, чарніцы.*

Правообладатель Народная асвета

## Падбяры словы

Узор. Не салодкі, а горкі.
Не высокі, а ... .
Не шырокі, а ... .
Не доўгі, а ... .
Не дужы, а ... .

**Выкарыстай словы:** *вузкі, слабы, нізкі, кароткі.*



пад ялінк — **ай**
за бяроз — **ай**



Складзі па малюнках сказы са словамі *пад, за*.

## Смяшынкі



**Смяшынкі — гэта вясёлыя і смешныя размовы або гісторыі.**

* * *

— Дзе ты жывеш? — спыталі Дусю.
— Там, дзе жыве мая бабуся.


Правообладатель Народная асвета

— А дзе жыве яна?
— Там, дзе я.

У Дусі спыталі адрас. А як ты адкажаш на пытанне *дзе ты жывеш*?

## Зразумеў па-свойму

— А чаму ты
сёння ў школу
не хадзіў,
скажы, сынок?
— Ты ж казала
ўчора, мама,
каб з кватэры
ні на крок.

?!

**1.** Як трэба разумець словы маці *з кватэры ні на крок*?

**2.** Знайдзі і прачытай спачатку словы з адным складам, затым — з двума, а потым прачытай словы з трыма складамі.

**Чытай правільна:** спы-та́ў у ся́б-ра, ня-ма́ ні-чо́-га дзіў-на-га, ад-ка-за́ў.

* * *

— Як ты думаеш, Янка, чаму рыбы нямыя? — спытаў Пеця ў свайго сябра.

Правообладатель Народная асвета

— Няма нічога дзіўнага, — адказаў Янка. — А ці мог бы ты гаварыць пад вадою?

Нямы́я — не гавораць.

**1.** Знайдзі і прачытай, пра што спытаў Пеця.
**2.** Што адказаў Янка?
**3.** Прачытай з таварышам тэкст па ролях.

## Параўнай словы

мы
ня — мы
ня — мы — ты

Што абазначаюць гэтыя словы? Што агульнае ў іх напісанні? А што рознае?

## Валёнкі стаміліся

Просіць бабку ўнучка:
— Вазьмі мяне на ручкі,
бо ў тваёй Алёнкі
стаміліся валёнкі.

**1.** Ці могуць стаміцца валёнкі?
**2.** Хто можа стаміцца? Растлумач.
**3.** Ці спадабаліся табе смяшынкі?
**4.** Які настрой яны выклікалі ў цябе?


Правообладатель Народная асвета



Прыдумай сваю смяшынку.

**Выкарыстай сказы:** *дзядуля і ўнук, пайшлі па ваду, вёдры стаміліся.*

**Чытай правільна:** аку-ля́-рах, на-ста́ў-нік, ву-чы́ц-ца, са-пса-ва́ў-ся, тэ-ле-ві́-зар.

## У цёмных акулярах

— Чаго ты  
ў цёмных акулярах  
ідзеш у школу, Ігарок?  
— Каб па вачах  
не ведаў настаўнік,  
што я не вывучыў урок.

Правообладатель Народная асвета

* * *

— Ты пачаў, Ясь,
лепш вучыцца
і як след
за кнігі ўзяўся.
— Ды ты ж ведаеш,
бабуля, тэлевізар
сапсаваўся. *Авяр’ян Дзеружынскі*

**1.** Пра якіх дзяцей піша аўтар (*лянівых, працавітых*)?
**2.** Прачытайце смяшынкі па ролях.
**3.** Складзі словы з рассыпаных літар:
а, к, у, я, л, а, х, р;
т, э, л, а, е, з, і, в, р.

## Небыліцы

**Небыліца — тое, чаго на самай справе не бывае.**

**Чытай правільна:** ха-ло́д-нень-кай, ка-ла́-чы-кі па-кра́ў, дзі-ця́т-ка, вар-таў-ні́к, па-но́-ша-ны, вар-та-ва́ць.

* * *

Пякла баба калачы
у халодненькай пячы.
І якраз ляцеў камар
і калачыкі пакраў.




Правообладатель Народная асвета

Як ты думаеш, ці магло такое адбыцца? Чаму?

Кала́ч — булка.

## Аладка

Кажа нянька:<br>
— Спі, дзіцятка,<br>
хутка зварыцца аладка.<br>
Нянька кажа няправільна.<br>
Чаму?

*Уладзімір Паўлаў*

Колькі літар і гукаў у слове *нянька*?

## Вартаўнік

У паношаны камзол<br>
сунуў хлеба лусту<br>
і пайшоў стары казёл<br>
вартаваць капусту.<br>
Не пускайце, спыніце казла!<br>
Чаму?

*Уладзімір Паўлаў*

Камзо́л — куртка-безрукаўка.

**1.** Што робіць вартаўнік?<br>
**2.** Што сунуў у камзол казёл?<br>
**3.** Што пайшоў рабіць казёл? Прачытай.<br>
**4.** Які малюнак можна зрабіць да небыліцы? Апішы яго словамі.

Правообладатель Народная асвета

* * *

Я за рэхам
лесам бег.
Як дагнаў,
схаваў у мех.

**1.** Што такое рэха? Ці чуў ты яго?
**2.** Ці можна схаваць рэха ў мех?
**3.** Колькі сказаў у небыліцы?
**4.** Прачытай першы сказ.
**5.** Прачытай другі сказ.

## Апанас

Казаў дзядзька Апанас:
— Пасадзіў я ананас.
А ў садочку ў цёткі Ганны
хутка выспеюць бананы.

*Уладзімір Паўлаў*

Дзядзька Апанас пажартаваў. Чаму? А што ў нас выспявае ў садзе?

## Аловак

Растуць на вербах грушы,
кукуе ў лесе шпак,
у маі снег цярушыць,
і ў снежні спее мак.


Правообладатель Народная асвета

Злавіла мышка кошку,
а рыбка — рыбака.
Зрабілася дарожкай
глыбокая рака.
Сякеру і лапату
ў гародзе садзіць брат,
вядзе дзяўчынка тату
у свой дзіцячы сад.
З бадліваю каровай
злы воўк пасябраваў...
Так захацеў аловак
і ўсё намаляваў.

*Міхась Казакоў*

?!
**1.** Што наблытаў вясёлы аловак?
**2.** Дапамажы яму намаляваць усё правільна.

## Загадка

Ляжыць паленца, а ўсярэдзіне сэрца.



Знайдзі адгадку на малюнку.

Правообладатель Народная асвета

# Скорагаворкі

**Скорагаворка — жартаўлівы сказ або вершык, які трэба хутка і правільна вымавіць.**

**Чытай правільна:** го́-рач-кай, Яго́-рач-ка, пры-ту-лі́ў, пі-ла-ва́ў, па-ле́н-не, ці-ка́-віць.



* * *

Горкай, горкай, горачкай
ішоў малы Ягорачка.

* * *

Прытуліў пілу Піліп,
пілаваў
паленне з ліп.

Прытулі́ў — прыгарнуў да сябе.

* * *

Піліп да пернікаў прынік.
Паеш лепш персікаў, Піліп.

**1.** Прачытай скорагаворкі спачатку моўчкі, потым гучна.

**2.** Якія імёны дзяцей ёсць у скорагаворках?

**3.** Па якой літары можна хутка знайсці імя ў тэксце?

**4.** Перачытай скорагаворкі, якія адпавядаюць малюнкам.

* **5.** Навучыся хутка чытаць скорагаворкі.


Правообладатель Народная асвета



* * *

На бярозе рак,
а ў рачулцы грак.

* * *

Пад канапай крот,
а ў нары кот.

*Ніна Галіноўская*

?!

**1.** Ці ўсё правільна ў скорагаворках?

**2.** Прачытай скорагаворкі шмат разоў: спачатку павольна, потым — хутка. Вывучы адну скорагаворку на памяць.

**3.** Знайдзі ў тэкстах словы са складамі **ка, ра.**

Правообладатель Народная асвета



# АСЕННЯЯ СТАРОНКА

**Чытай правільна:** мя-цé-лі-цай, га-ман-лі́-вая, ка-ло́с-ся-мі.

## Поры года

Восень
лісцямі
жоўтымі
сцелецца.
Завывае
зіма
мяцеліцай.

Як ручай,
вясна
гаманлівая.
Лета
шэпча
калоссямі
з ніваю.

*Авяр'ян Дзеружынскі*

Ні́ва — поле, пашня.

**1.** Пералічы поры года.
**2.** Знайдзі і прачытай, чым адметная кожная пара года.


Правообладатель Народная асвета

**3.** Як ты разумееш словы *вясна гаманлівая*?
**4.** Як бы ты намаляваў лета? Апішы словамі. Якія колеры ты выкарыстаеш?
**5.** Што яшчэ адбываецца летам у прыродзе?

## Загадка

Дзве сястры: адна белая, другая зялёная. Калі адна прыходзіць, другая — уцякае.

Знайдзі адгадку (*вясна, зіма, восень, лета*).

**Чытай правільна:** до́ж-джы-кам, нат-хнё-наю.

## Хлебная скарынка

Пахне хлебная скарынка
цёплым ветрыкам,
хваінкай,
летнім дожджыкам грыбным,
лугам,
полем аржаным,
і асенняй пазалотай,
ды натхнёнаю работай.

*Авяр’ян Дзеружынскі*

**1.** Прачытай, чым пахне хлебная скарынка.
**2.** Як ты разумееш выраз *Пахне хлебная скарынка ... натхнёнаю работай*?

Правообладатель Народная асвета

**3.** Спытай у дарослых, з чаго і як атрымліваюць хлеб. Запомні гэта і беражы хлеб.

## Скорагаворка

Пекар Пётр пёк пірог.

Навучыся правільна і хутка чытаць скорагаворку.

**Чытай правільна:** за-ла-ці́с-тыя, дух-мя́-ныя, ан-то́-наў-кі, пры-бі-ра́ць, чы́р-вань.

## Верасень

Месяц Верасень багаты. Ходзіць па зямлі і дорыць ёй свае багацці.

Зайшоў Верасень у сад. Атрос грушы залацістыя. Асыпаў духмяныя антонаўкі, пакрыў туманамі сінія слівы.

Потым пайшоў Верасень у поле. Там ён паставіў мяхі з бульбай.

Затым Верасень падаўся ў лес. І пачаў прыбіраць дрэвы ў дарагія ўборы. Асіну — у чырвань, бярозу — у золата, дубам даў медны ўбор. Пад пянёчкі і кусточкі пасадзіў грыбы...

Багаты месяц Верасень, багаты! Ён падарыў зямлі пышныя шаты.

*Клаўдзія Каліна*

Ша́ты — убор.
Духмя́ны — які прыемна пахне.


Правообладатель Народная асвета

?!

**1.** Якой пары года месяц верасень?
**2.** Якія яшчэ асеннія месяцы ты ведаеш?
**3.** Прачытай, што зрабіў Верасень у садзе.
**4.** Прачытай, як апісаны грушы.
**5.** Што зрабіў Верасень у полі? Прачытай.
**6.** Якія змены адбыліся ў лесе? Прачытай. Як упрыгожыў Верасень асіну, бярозу, дубы?
**7.** Чаму верасень называюць мастаком?
**8.** Ці бываў ты ў лесе ў верасні?

## Лістапад

На дарозе — лісце-жар.
Па лясах —
пажар, пажар.
Ліска збочыла
з дарогі:
апячэш
яшчэ тут ногі!

*Генадзь Шмань*



Правообладатель Народная асвета

**1.** Разгледзь малюнак. Якога колеру лісце восенню?

**2.** Чаму ў вершы лісце-жар? Як ты гэта разумееш?

**3.** Што за пажар у лясах восенню?

**4.** Чаму напужалася ліска?

## Прымаўкі

**Чытай правільна:** рых-ту́й-це-ся.

Восень — на дзень пагод восем.
Увосень за стол просім.
Рыхтуйцеся да восені ранняй вясной.

Растлумач кожную прымаўку.

## Хачу ўсё ведаць

Спытай у таварыша, мамы, таты, падумай сам.

**1.** Што такое прырода?

**2.** Што мы маем на ўвазе, калі кажам *трэба берагчы прыроду*?

**3.** Што трэба рабіць, каб сябраваць з прыродай?

**Чытай правільна:** па-да-сі́-на-вік, пры-кі́-нуў-ся.

## Хітры падасінавік

Ішоў па лесе грыбнік. У адной руцэ трымаў вялікі кош, у другой — востры нож.


Правообладатель Народная асвета

Раптам грыбнік убачыў у траве чырвоную шапачку падасінавіка. Нагнуўся, каб падрэзаць грыб.

— Ну вось! — сказаў ён. Гэта асінавы лісток прыкінуўся падасінавікам.

Пайшоў грыбнік далей. Убачыў каля асінкі чырвоную плямку, але не звярнуў на яе ўвагі і прайшоў міма.

А гэта быў падасінавік. Ён прыкінуўся асінавым лістком.

*Змітрок Бяспалы*

?!

**1.** Перачытай апавяданне моўчкі. Пра што ў ім расказваецца?

**2.** Як аўтар апісвае падасінавік?

**3.** Падумай і скажы, чаму падасінавік названы хітрым.

**Ці ведаеш ты грыбы?**



баравік



падасінавік



падбярозавік

Правообладатель Народная асвета



паганка



лісічка



мухамор

?!

**1.** Якія з гэтых грыбоў можна есці?

**2.** А якія грыбы ядавітыя?

**3.** Калі збіраюць грыбы: зімой, восенню, вясной, летам?

**4.** Ці збіраў ты грыбы? Раскажы пра гэта.

## Цёплы грыб

Пад ялінкай рос стары баравік. Век яго ўжо канчаўся. Нага скрывілася, высахла і ледзь трымала на сабе шырокую шапку.

Ішоў я па лесе і ўбачыў гэты баравік. Хацеў збіць нагой — усё адно нікому не патрэбен. У гэты самы момант з-пад грыба шмыгнула маленькая рыжая мышка.

Я прысеў каля грыба і зірнуў пад яго шапку. Каго там толькі не было: і матылёк, і вусень, і страказа, і жучкі! Нават жабка была. Як у тым церамку.


Правообладатель Народная асвета

Я дакрануўся пальцамі да грыба, а ён — цёплы. Дзень жа быў халодны, з раніцы ішоў дожджык. Вось грыб і сабраў пад сваю шапку гэтых жыхароў лесу. І прыгрэў, і ад дажджу схаваў.

*Васіль Хомчанка*

## Выправі памылкі



лісічка



сыраежка



падасінавік

## Загадка

Маленькі, удаленькі, скрозь зямлю прайшоў, чырвоную шапачку знайшоў.

Выберы адгадку (*лісічка, баравік, падасінавік*).

## Павучок

Ад лісцінкі
да сучка
без кручка,
без чаўначка

цягне, цягне
павуцінку
і не ведае
спачынку,

Правообладатель Народная асвета



сетку вяжа
павучок,
начапіўшы
на сучок.

*Мікола Бусько*

?!

**1.** Дзе павучок цягне павуцінку: у лесе ці дома? Адкуль гэта відаць?

**2.** Як працуе павучок? Прачытай.

**3.** Вывучы верш на памяць.

**4.** Вызнач, у якой паслядоўнасці трэба чытаць сказы:

*Не спяваюць птушкі.*

*Прыйшла восень.*

*Трава парыжэла.*

*Сонейка грэе слаба.*

*Стала холадна.*

## Казкі

**Чытай правільна:** пры-ка-ці́ў-ся, зда-лёк, ка́-зач-най, па-сяб-ру́й-це.

* * *

— Дзе ты быў, Калабок?
— Прыкаціўся я здалёк.
Быў у казачнай краіне.



Правообладатель Народная асвета



Казак шмат вязу на спіне.
Пасябруйце са мной —
раскажу ўсе да адной.

?!

1. Пра што спыталі ў Калабка?
2. А што ён адказаў? Прачытай.
3. Ці памятаеш ты казку пра Калабка? Ад каго Калабок пайшоў?
4. З кім ён сустрэўся ў дарозе? Знайдзі на малюнку.
5. Каго з герояў няма на малюнку?
6. Успомні, што здарылася з Калабком.

**Чытай правільна:** пы-та́-ец-ца, ад-кла́д-ваю, рых-ту́ю-ся, ра-ман-ту́ю, шчы́-лін-кі, пры-па́-са-мі, дзя-лю́-ся.

Правообладатель Народная асвета

## Вавёрка і Заяц

Весела скача з галінкі на галінку Вавёрка. Убачыў яе Заяц і пытаецца:

— Чаму ты заўсёды такая вясёлая?

— А таму, што работы многа і работа прыемная. Арэшкі збіраю, у дупло нашу. Грыбы











Правообладатель Народная асвета

шукаю, на зіму сушу. Ні адну справу назаўтра не адкладваю, да зімы рыхтуюся. Дупло рамантую, шчылінкі затыкаю, каб цяплей было. З суседзямі не сваруся, зімой прыпасамі з імі дзялюся.

Задумаўся Заяц. Ён заўсёды весела скача, а чаму радуецца? Ці ёсць з гэтага карысць?

?!

**1.** Прачытай казку моўчкі.
**2.** Пра каго расказваецца ў казцы?
**3.** Прачытай, пра што запытаўся Заяц.
**4.** Прачытай адказ Вавёркі.
**5.** Якой можна назваць Вавёрку: *вясёлай, добрай, дрэннай, працавітай, скупой, шчодрай*?
**6.** Знайдзі ў тэксце словы, якія даказваюць, што Вавёрка працавітая.
**7.** Пра што задумаўся Заяц? Прачытай.
**8.** Складзі апавяданне па малюнках.

**Выкарыстай словы:** *убачыў, пытаецца, збіраю, сушу, рамантую, дзялюся.*

## Прыказка

Рана ўстанеш — многа зробіш.

**Чытай правільна:** вы́-бег-лі, па-гна́-лі-ся, уця-ка́-лі, гля-дзе́-лі, уха-пі́-лі-ся, вы́-цяг-ну-лі.

Правообладатель Народная асвета

## Лісіца і сабакі

*(Руская народная казка)*

Бегла лісіца па полі. Раптам з кустоў выбеглі сабакі і пагналіся за ёю.

Лісіца ўцякаць. Бегла, бегла ды пад пянёк у нару залезла. Сядзіць у нары і кажа:

— Вушкі, вушкі, што вы рабілі?

— Мы слухалі ды слухалі, каб сабакі лісічку не з’елі.

— Ножкі, ножкі, што вы рабілі?

— Мы ўцякалі, каб сабакі лісічку не дагналі.

— Вочкі, вочкі, што вы рабілі?

— Мы глядзелі, каб сабакі лісічку не з’елі.

— А ты, хвост, што рабіў?

— Я за пні, за кусты чапляўся.

— А, дык ты вунь які! Наце ж, сабакі, ешце мой хвост!

Сабакі ўхапіліся за хвост і выцягнулі лісу.

Ледзь жывая ўцякла яна ад іх.

?!

**1.** Прачытай казку шэптам.

**2.** Пра каго расказваецца ў казцы?

**3.** Вясёлы ці сумны настрой выклікае казка? Чаму?

**4.** Дзе схавалася ліса ад сабак?

**5.** Якія пытанні задавала лісіца?

**6.** Што адказвалі лісе вушкі, ножкі, вочкі, хвост?



Правообладатель Народная асвета

**7.** Чаму ліса аддала сабакам свой хвост?

**8.** Як ты думаеш, якая ліса ў гэтай казцы: *вясёлая, хітрая, неразумная*?

**Чытай правільна:** за-ха-цé-ла-ся, ха-дзі́ў, за-ша-ма-цé-ла, зве-ра-ня́т-ка, за-плю́-шчы, спа-да-бá-ла-ся.

## Коцік Петрык і мышка

*(Беларуская народная казка)*

Аднаго разу коцік Петрык захацеў мышку злавіць. Ён быў яшчэ маленькі, але чуў ад дарослых катоў, што яны заўсёды ловяць мышэй. І Петрыку вельмі ж захацелася стаць хутчэй дарослым.

Пайшоў ён у гумно. Хадзіў сюды-туды — нікога няма. Раптам у кутку нешта зашумела. Петрык скокнуў туды і ўбачыў маленькае зверанятка.

— Ты хто? — спытаў Петрык.

— Мышка.

— Вось ты мне і патрэбна.

— Навошта?

— Я не ведаю навошта, але катам трэба лавіць мышэй.

Мышка пасмялела і кажа:

— Каты ловяць мышэй, каб гуляць з імі ў ката і мышку. Хочаш, навучу цябе?

— Хачу! — сказаў коцік.



Правообладатель Народная асвета

— Тады стань у куток, заплюшчы вочы і лічы да трох, а потым лаві мяне.

Спадабалася гульня Петрыку. Ён стаў у куток, заплюшчыў вочы. А калі далічыў да трох, мышкі было ўжо не дагнаць…

Гумнó — месца, дзе захоўваецца зерне.

1. Ці хацелася табе дапамагчы мышцы?
2. Як перахітрыла мышка коціка? Раскажы.
3. Як звалі коціка? А якое імя ты даў бы мышцы?
4. Ці ведаеш ты гульню «Кошкі-мышкі»? Раскажы.
5. Вызнач, якія словы гаварыў коцік, а якія — мышка.
6. Якімі сказамі з тэксту можна падпісаць малюнак?

**Чытай правільна:** зяр-ня́т-кі, пры-та-і́ў-ся, па-мы́ў-шы-ся, раз-зла-ва́ў-ся, сне́-дан-ня.

## Чаму кот толькі пасля снедання мыецца?

*(Літоўская народная казка)*

Заляцеў аднойчы раніцай верабей у ячмень ды дзяўбе сабе зярняткі. А кот тут як тут. Прытаіўся — хоп вераб'я і павалок яго сабе на снеданне.


Правообладатель Народная асвета

А верабей гаворыць:

— Пане кот! Дзе гэта бачна, каб такі важны кот снедаў не памыўшыся?

Сорамна стала кату. Паклаў ён вераб'я на зямлю і давай лапай мыцца.

А вераб'ю толькі гэта і трэба было. Ён доўга не чакаў — пырх — і паляцеў. Раззлаваўся кот і з таго часу вырашыў: мыцца ён цяпер не да снедання, а толькі пасля снедання будзе!

1. Ці зацікавіла цябе казка? Чым?
2. Прачытай, што здарылася з вераб'ём.
3. Як верабей перахітрыў ката? Прачытай.
4. Чаму кот мыецца пасля яды?
5. Зрабі дома малюнкі да казкі.
6. Задай да казкі свае пытанні са словамі: *Куды...? Дзе...? Што...? Як...? Калі...?*

## Сарока-манюка



Жыла-была Сарока.

Лятала па лесе зялёным, стракатала без угамону. Але ўсім было вядома, што яе стракоткі-бразготкі — звычайныя плёткі. Як кажуць, чула звон, ды не ведае, дзе ён. І таму яе крык ніхто не браў у разлік.

Хто ведае, колькі б так цягнулася яно, каб не здарылася няшчасце адно. За нейкі птушыны

Правообладатель Народная асвета



грэх, як кару, нагнаў вецер на лес хмары. Гром грукоча, аж трасецца дом сарочы. І маланкі б’юць — слепяць звысоку — проста жах бярэ Сароку.

Сядзіць яна ў гняздзе, прыціхла — хутчэй бы прайшло гэта ліха! Аднак бяда не мінула гнязда. І ўспыхнула мілае гняздзечка, як свечка.

Узнялася з гнязда Сарока, крычыць-лямантуе белабока:

— Птушкі і птушаняткі, гарыць мая хатка! Набярыце ў дзюбы вады — і хутчэй сюды, дзе маланка з-пад хмар мне прынесла пажар!..


Правообладатель Народная асвета

Чуюць птушкі лямант сарочы, толькі веры даць не хочуць. Бо сарочыя плёткі ім вядомы ўсё-ткі.

Так і згарэла гняздо датла.

І ўсё таму, што манюкай Сарока была.

*Алесь Зэкаў*

?! **1.** Што здарылася з Сарокай? Раскажы.

**2.** Чаму яе напаткала гора?

**3.** Як ты разумееш выраз *успыхнула мілае гняздзечка, як свечка*?

**4.** Звярні ўвагу, як напісана казка. На што яна падобна?

**5.** Які ўрывак з казкі адлюстраваны на малюнку?

✻ **6.** Знайдзі ў казцы рыфмаваныя словы: *стракоткі — бразготкі — плёткі, крык — разлік, яна — …, звысоку — …, бяда — …, гняздзечка — …, сарока — …, вады — …, хмар — … .*

**Чытай правільна:** Ве́т-ры-кам, Ня-су́ш-кай, буджу́, жа-ра-бя́т-кі, Кры-ку-но́м, Упа́р-тым, сту́к-ну-ла.

## Каго як завуць?

— Чаму цябе Ветрыкам завуць? — спыталіся ў жарабяткі.

— Я хутка бегаю, як вецер.

Правообладатель Народная асвета

— А цябе Нясушкай за што? — спыталіся ў курыцы.

— Я яйкі нясу.

— А цябе Крыкуном? — спыталіся ў пеўня.

— Я моцна крычу і ранкам сваім крыкам людзей буджу.

— А цябе Упартым? — спыталіся ў асла.

— Не скажу! — адказала асляня і стукнула капытом па зямлі.

— Чаму?

*Анатоль Клышка*











Правообладатель Народная асвета

?! **1.** Растлумач слова *ўпарты*.
**2.** Каго як называюць і чаму?
**3.** Прачытай пытанні да жарабяткі і яго адказ; да курыцы і яе адказ; да пеўня і яго адказ; да асла і яго адказ. Захоўвай, дзе трэба, пытальную і клічную інтанацыі.
**4.** Размяркуйце казку па ролях і прачытайце.

## Складзі прыказку





Шкадлівы, як ..., баязлівы, як ... .

**Чытай правільна:** спад-ціш-ка́, пры-но́-сіць, ры-жа-ва́-ты, ня-ця́ж-ка.

## Пазнай герояў

Я такую маю моду —
спадцішка прыносіць шкоду.
Многім я далася ў знак.
Я — бабуля Шапа... .

(к, я, л, к)

Правообладатель Народная асвета

Я маленькі, рыжаваты,
вельмі на сяброў багаты.
Адгадаць зусім няцяжка —
я завуся Чабу... .  (а, ш, к, р, а)

Дапоўні імёны герояў з мультфільмаў.

**Чытай правільна:** па-пра́-віў-ся, пра-со́ў-ва-еш-ся, дзве́-ры, ме-дзве-дзя-ня́т-ка.

## Віні-Пух у доктара

— Ты за лета, Віні-Пух,
так паправіўся, распух,
ледзь прасоўваешся ў дзверы.
Ну, прызнайся — еў без меры
мёд, маліны і карэнні,
усялякія варэнні.
Віні-Пух, медзведзянятка,
прапішу табе зарадку,
есці — меней напалову.
Будзеш стройны і здаровы.



*Ніна Галіноўская*

1. З якого мультфільма гэтыя героі?
2. Каго яшчэ з гэтага мультфільма ты памятаеш?
3. Раскажы цікавую гісторыю з мультфільма пра Віні-Пуха.
4. Дома зрабі малюнак да верша.


Правообладатель Народная асвета

# Дзед і два мядзведзі



Правообладатель Народная асвета

?!

1. Разгледзь малюнкі на старонцы 53.
2. Куды ідзе дзядуля?
3. Што ён робіць у лесе?
4. Чаму ён не закончыў працу?
5. Хто і як дапамог дзядулю?
6. Прыдумай працяг казкі.

**Выкарыстай словы:** *вярнуўся, убачыў, здзівіўся, узрадаваўся.*

## З якой мы казкі?





Успомні, з якіх казак гэтыя героі.
Перакажы казкі.


Правообладатель Народная асвета

## Прыказкі

Лёгка пасварыцца — цяжка памірыцца.
Што аднаму цяжка, то гуртам лёгка.

Гу́ртам — разам.

Растлумач прыказкі.

## Былі

**Былі — гэта апавяданні з жыцця.**

**Чытай правільна:** у зго́-дзе, слу́-ха-лі-ся, пры-не́с-лі, зла-мі́-це, ту́-жы-лі-ся, раз-вя-за́ў, па-ла-ма́-лі, сва-ры́ц-ца, за-гу-бі́ць.

### Бацька і сыны

Бацька загадаў сынам, каб жылі ў згодзе. Яны не слухаліся. Тады ён сказаў, каб яму прынеслі венік.

— Зламіце яго!

Колькі яны ні тужыліся, не маглі зламаць. Тады бацька развязаў венік і загадаў ламаць па адным пруціку. Сыны лёгка паламалі ўсе пруцікі па адным.

Бацька кажа:

Правообладатель Народная асвета

— Вось так і вы. Жывіце ў згодзе, тады ніхто вас не адолее. А калі будзеце сварыцца — вас кожны лёгка загубіць.

*Леў Талстой*

Ж ы ц ь  у  з г о́ д з е — жыць мірна, дружна.

**1.** Якую параду даў бацька сынам? Прачытай.
**2.** Як бацька даказаў сынам, што трэба жыць у згодзе? Раскажы.
**3.** Ці згодзен ты з бацькам? Чаму?
**4.** Якую іншую назву можна даць гэтай былі?
**5.** Перачытай быль. Знайдзі словы, у якіх ёсць літара **ў**. Успомні, у якіх выпадках пішацца літара **ў**.

**Чытай правільна:** па-ка́з-ва-ла, пры-го́-жая, па-ста́ў-лю, ува́ж-лі-ва па-гля-дзе́-ла, за-ду́-ма-ла-ся.

## Такіх кветак не бывае

Неяк гэтым летам мая суседка Таня збірала на лузе кветкі. Яна паказвала іх мне і казала:

— Вось якая прыгожая кветка! І гэтая прыгожая… І вось гэтая. Я занясу іх бабулі і пастаўлю ў вазу.

— А ты пашукай непрыгожую, — сказаў я. — Самую непрыгожую.


Правообладатель Народная асвета

Таня ўважліва паглядзела мне ў вочы і задумалася.

— Такіх кветак не бывае, — адказала яна. Потым яшчэ падумала, зноў паглядзела мне ў вочы і рашуча сказала:

— Нідзе не бывае!

*Вісарыён Гарбук*





**1.** Што рабіла Таня на лузе? Прачытай.
**2.** Ці можна згадзіцца з Таняй, што кветак непрыгожых не бывае? Растлумач.
**3.** Знайдзі ў тэксце словы, у якіх тры і больш складоў. Навучыся хутка чытаць іх.
**4.** Паглядзі на малюнак. Якія кветкі стаяць у вазе? Назаві іх. Якія яшчэ кветкі ты ведаеш?
**5.** Прыдумай загадку пра адну з кветак.

**Чытай правільна:** та-ва́-ры-шы, мядз-ве́дзь.

## Два таварышы

Ішлі лесам два таварышы, і выскачыў на іх мядзведзь. Адзін кінуўся бегчы, узлез на дрэва і схаваўся. Другі застаўся на дарозе. Рабіць яму не было чаго — ён упаў на зямлю быццам мёртвы.

Мядзведзь падышоў да яго і стаў нюхаць: ён і дыхаць перастаў. Мядзведзь панюхаў яго твар, падумаў, што ён мёртвы, і адышоў.

Правообладатель Народная асвета

Калі мядзведзь пайшоў, другі таварыш злез з дрэва і смяецца:

— Ну што мядзведзь табе на вуха гаварыў?

— А ён сказаў, што кепскія людзі тыя, якія кідаюць таварыша ў бядзе.

*Леў Талстой*

1. Што зрабілі дзеці, калі ўбачылі мядзведзя?
2. Што зрабіў мядзведзь?
3. Пра што спытаў таварыша хлопчык, які злез з дрэва? Што яму адказаў таварыш? Прачытай.
4. Ці можна назваць хлопчыкаў таварышамі?
5. Прачытай тэкст моўчкі.
6. Перакажы апавяданне блізка да тэксту.

**Выкарыстай словы і выразы:** *два таварышы, выскачыў мядзведзь, мядзведзь панюхаў, пайшоў, злез з дрэва, на вуха гаварыў, кепскія людзі, кідаюць у бядзе.*

## Прыказкі

Таварыша пазнаеш у бядзе.

Прыяцеля за грошы не купіш.

Якая прыказка падыходзіць да апавядання «Два таварышы»?

**Чытай правільна:** ма-ле́нь-кая, па-ста́-ві-ла, ві́-шань-ка-мі, па-гля-дзе́-ла.


Правообладатель Народная асвета

## Кампот

Маленькая Галя вельмі любіць дапамагаць маме. Сёння мама даручыла Галі памыць сушаныя яблыкі для кампоту.

За абедам мама сказала:

— Ну, цяпер будзем піць кампот нашай дачушкі.

Мама паставіла ўсім кубкі. А перад Галяй — яе любімы, з вішанькамі.

Тата адпіў крыху з кубка і зірнуў на маму. Мама зрабіла глыток і паглядзела на Галю. Паглядзела і пытаецца:

— Дачушка, ці добра ты памыла яблыкі?

— Так, мамачка, вельмі добра. Я іх нават мылам мыліла!

*Клаўдзія Каліна*

?!

**1.** Вызнач, колькі герояў у апавяданні.

**2.** Якую памылку зрабіла Галя? Чаму кампот нельга было піць?

**3.** Ці было табе смешна? Чаму?

**4.** Знайдзі словы з двух, трох і чатырох складоў, навучыся хутка чытаць іх.

**5.** Знайдзі словы з падвоенымі зычнымі, словы з **дз**. Правільна прачытай гэтыя словы.

**6.** Раскажы, як ты дапамагаеш маме.

Правообладатель Народная асвета

## Складзі словы

ма

ліна | лако | кра | шына

## Якое слова заблудзілася?

Садавіна: яблыкі, абрыкосы, грушы, цыбуля, слівы, селядзец.

Гароднiна: памідоры, агуркі, бульба, батоны, малако, буракі.

**Чытай правільна:** ста-ра́н-ны, гуль-та́й, па-гу-ля́ю, на-ву-чу́-ся, дзі́-рач-кі, све́-цяц-ца, ад-ка́з-вае.

## ✻ Дзіркі новыя

Прыйшоў Толік да суседа. На штоніках дзірачкі свецяцца.

— Ты што ў старых штоніках прыйшоў? — пытае сусед.

— Не такія яны ўжо і старыя, — адказаў Толік.

— А што ты новае ў іх знайшоў?

— Дык вось дзіркі новыя. Мама кажа, што ў мяне кожны дзень дзіркі новыя.

*Мікола Янчанка*


Правообладатель Народная асвета

**1.** Ці смешнае гэта апавяданне? Чаму?
**2.** Што ты параіш Толіку?
**3.** Знайдзі ў тэксце словы з літарамі **й, дз, цц**. Чытай іх правільна.

## Старанны і гультай

— Заўтра павучуся, а сёння пагуляю, — кажа (хто?)... .
— Заўтра пагуляю, а сёння павучуся, — кажа (хто?)... .
Замест *хто?* устаў патрэбнае слова.

## Прачытай

Спявай, гуляй, трымай, збірай, дай.
Да кожнага слова дадай склад **це**. Якія словы атрымаліся? Назаві іх.

## Параўнай словы

НОС — СОН
КОТ — ТОК

**1.** Што абазначаюць гэтыя словы?
**2.** Чым яны адрозніваюцца?

## Складзі прыказкі са слоў

Не пакідай, што, назаўтра, можна, тое, зрабіць, сёння.
Гуляй, ведай, і, але, работу.

Правообладатель Народная асвета

## Гульня «І я разам»

— Пайду ў лес.
— І я разам.
— Зрэжу дрэва.
— І я разам.
— Высеку з яго карыта.
— І я разам.
— Будуць з яго куры ваду піць.
— І я разам.

Хто сказаў: «І я разам», выбывае з гульні.

Хто ж сказаў: «А я не», той застаецца, і гульня працягваецца.

«Пайду на луг…».
«Пайду на рэчку…».
«Пайду ў школу…».

Правообладатель Народная асвета



# Я І МАЯ СЯМ’Я

## Прыказка

Дзе маці нарадзіла, там і Радзіма.

**Чытай правільна:** Ра-дзí-ма, дзя-дý-ля, ся-мéй-ні-кі, пар-трэ́-ты, фа-та-грá-фіі, гіс-тó-ры-яй, за-дýм-ваў-ся, яд-нá-юц-ца.

## Твой род, твая Радзіма

Маці, бацька, браты, сёстры. Яны твае самыя родныя, блізкія. Добра, калі ў цябе ёсць бабуля, дзядуля. Гэта з самага малку твае дарагія сямейнікі. Калі ж іх ужо няма, ці ведаеш ты, хто яны былі, што рабілі? Ці ёсць у вас дома іх партрэты, іх фатаграфіі? Успомні пра іх.

Бо твая памяць — гэта памяць твайго роду. А над ёю памяць народа — вялікая кніга, якая называецца гісторыяй.

Род і народ яднаюцца адным дарагім словам — Радзіма.

*Васіль Вітка*

Правообладатель Народная асвета

?! **1.** Уважліва прачытай тэкст.
**2.** Хто такія сямейнікі? Знайдзі адказ у тэксце.
**3.** Што ты ведаеш пра сваіх блізкіх? Раскажы.
**4.** Знайдзі ў тэксце пытальныя сказы.
**5.** Адкажы на пытанні, якія ёсць у тэксце.
Раскажы пра сваю сям'ю па плане.
1) Я нарадзіўся ў горадзе (вёсцы) ... .
2) Маю маму завуць ... .
3) Яна працуе ... .
4) Майго тату завуць ... .
5) Ён працуе ... .
6) У мяне ёсць сястрычка і брацік. Іх завуць ... .
7) Мае дзядуля і бабуля жывуць у горадзе (вёсцы) ... .

**Чытай правільна:** ста-рэ́й-шыя, сяс-тры́-цы, му-зы-ка́нт.

## Сямейны хор

У нас вялікая сям'я:
бабуля, мама, тата, я
і два старэйшыя браты,
сястрыцы дзве.
Прыходзь і ты.
У выхадны,
у вольны час
цікава, весела ў нас:
спявае наш сямейны хор.

*Ніна Галіноўская*


Правообладатель Народная асвета



?! **1.** З каго складаецца сямейны хор? Знайдзі ў тэксце.

✻ **2.** Пакажы на малюнку, хто дырыжор, хто салiст, а хто музыкант.

**3.** Што ты можаш сказаць пра *вялікую сям'ю*? Якая яна? Знайдзі адказ (*вясёлая, сумная, дружная*).

**4.** Складзі маленькае апавяданне «Мой брат» або «Мая сястра» па плане.

1) Як завуць?
2) Колькі гадоў?
3) Што ўмее добра рабіць?
4) Што асабліва любіць?

Правообладатель Народная асвета

## ✻ Мая сястра

У калясцы едзе сястрычка.
Усміхаюцца ўсе малой.
На бярозцы цінь-цінь сінічка —
гэта песня таксама ёй.
Села сонца на круглы тварык
і шапнула: «Хутчэй расці!»
У сястрычкі такія мары:
стаць на ножкі, самой пайсці.
Дачакаемся, будзь цярплівай.
Крыкнуць хочацца мне: «Ура!»
Гляньце ўсе, я такі шчаслівы:
у калясцы мая сястра.

*Ніна Галіноўская*

?!

**1.** Чаму хлопчыку радасна?
**2.** Што ўзрушыла яго?
**3.** Якія малюнкі можна зрабіць да верша? Апішы іх словамі.

## Прыказкі

Якая мая мама, такая і я сама.
Не рабі другому, што не люба самому.
Як ты да людзей, так і яны да цябе.

**Чытай правільна:** раз-бу-ры́ць, па-дзя-лі́-ся.


Правообладатель Народная асвета

## Мікола і Маша

У Міколы сястрычка малая,
і яна яму жыць замінае.
То заплача яна не ў пару́,
то разбурыць з пясочку гару,
то сандалікі ў Машы зняліся,
то цукеркаю з ёй падзяліся.
Ды без Машы таксама не мёд:
цішыня і ніякіх прыгод.

*Галіна Каржанеўская*

З а м і н а́ е — перашкаджае.

**1.** Чым непадобны Мікола да хлопчыка з верша «Мая сястра»?
**2.** Які з хлопчыкаў табе больш спадабаўся? Чаму?
**3.** Прачытай, чым перашкаджае хлопчыку сястра.
**4.** Чаму без Машы хлопчыку *не мёд*? Растлумач.

### Прыказка

Ласкавае слоўка, як сонейка, грэе.

## Мае падарункі

Сам схаджу да рэчкі,
дзе цвітуць парэчкі.

Правообладатель Народная асвета



Для сястрыцы Светы
назбіраю кветак.
Прынясу таксама
падарунак маме:
— Мама, калі ласка, —
лугавыя краскі!

*Сцяпан Кацуба*

?! **1.** Як ты думаеш, які хлопчык: *добры, уважлівы, сур’ёзны, клапатлівы*?
**2.** Якія кветкі можна назбіраць на лузе?
**3.** Прачытай словы хлопчыка да мамы весела, ласкава.

## Абібок

Мама вяжа
рукавічкі, я ваксую
чаравічкі.
А на кухні
дзед з бабуляй
мыюць
міскі і каструлі.

Не сядзіць без справы
тата — робіць
санкі-самакаты.
Толькі коцік
абібок
каля печкі
грэе бок.

*Мікола Хамянкоў*

А б і б о́ к — гультай.

?! **1.** Апішы сям’ю з верша «Абібок». Якая яна: *вясёлая, вялікая, сумная, працавітая*?
**2.** Каго назвалі абібокам? Чаму?


Правообладатель Народная асвета

**3.** Падлічы, колькі чалавек у сям'і. А ці можна коціка назваць членам сям'і?
**4.** Якія малюнкі можна зрабіць да верша?

## Загадка

Бегла полем свінка,
залатая спінка.
Белым хвосцікам крутнула,
ой, у пальчык мой кальнула!
Што гэта за свінка,
залатая спінка,
што дзірачку зацыруе,
моцна гузік прымацуе,
фартушок прышые лоўка?



*Валянціна Коўтун*



З а ц ы р у́ е — зашые.

**Чытай правільна:** здзі-ві́ць, ат-ры-ма́-ла-ся.

## Радасць

Брат ляпіў сінічку,
каб здзівіць сястрычку.
Паднялі на смех
Мірона:
атрымалася — варона.
А сястрычка Лада
і вароне рада.

*Мікола Рудзішкін*

Правообладатель Народная асвета

?!

**1.** Прачытай верш моўчкі.
**2.** Што рабіў брат? З якой мэтай? Прачытай.
**3.** Чаму радавалася Лада?
**4.** Які гэта верш: *сумны* ці *вясёлы*? Дакажы.

**Чытай правільна:** спы-та́ў-ся, па-чыр-ва-не́ў-шы.

## Браты

— Што ты робіш? —
брат спытаўся. —
Я не разумею.
— Я ж пішу пісьмо Валодзю.
— Ты ж пісаць не ўмееш.

Адказаў, пачырванеўшы,
з гонарам Сярожа:
— Ну і што, калі не ўмею...
Ён чытаць не можа.

*Пятрусь Прануза*

?!

**1.** Прачытай, што рабіў Сярожа.
**2.** Чаму ён пачырванеў? Знайдзі адказ у тэксце.
**3.** Размяркуйце словы двух братоў і аўтара.
**4.** Прачытайце верш па ролях.

**Чытай правільна:** пры-пы́н-ку, па-дзя́-ка-ва-ла, усмі-ха́ў-ся, упер-шы-ню́.


Правообладатель Народная асвета

## Падзяка

Да прыпынку падышоў аўтобус. Дзіма разам з маці зайшоў праз пярэднія дзверы. На першых крэслах сядзелі маладыя людзі. Яны адразу ж усталі, каб даць месца Дзіму і яго маці.

Аўтобус крануўся. Праз два ці тры прыпынкі ў аўтобус зайшла бабуля. Дзіма хуценька ўсхапіўся з крэсла, каб села бабуля.

— Дзякуй табе, унучак, — сказала тая і села. Калі даехалі да свайго прыпынку і выйшлі з аўтобуса, Дзіма спытаў:

— Мама, а за што кажуць дзякуй?

— За ўсе добрыя справы, за павагу да людзей, — адказала маці. — І табе бабуля падзякавала за тое, што ты ёй, старэнькай, месца ўступіў.

Дзіма ўсміхаўся. Яму ўпершыню сказалі дзякуй.

*Павел Кавалёў*

**1.** Ці спадабаўся табе Дзіма? Чым?
**2.** Прачытай, чаму бабуля сказала Дзіму *дзякуй*.
**3.** Якія яшчэ ветлівыя словы ты ведаеш?

### Якія літары заблудзіліся?

Д З К Я У Й

Складзі слова.

Правообладатель Народная асвета

## Складзі прымаўкі з дапамогай пытанняў

Узор. Што лягчэй: зламаць ці наладзіць? — Лягчэй зламаць, чым наладзіць.

Што бачыць далей: вока ці розум?
Ці наносіш вады ў дзіравым вядры?
Ці вычарпаеш мора лыжкаю?

## Слова пра маці

Раней за ўсіх яна ўстае,
пазней за ўсіх яна кладзецца.
Яна жыве, яна пяе —
і дзецям лепш пяецца...

Каб не тужыла па начах, —
ёй падрастай на ўцеху!
Хай будзе ў матчыных вачах
пабольш іскрынак смеху!

Ты не шкадуй ласкавых слоў
для роднай, для адзінай.
Адказвай маці на любоў —
будзь верным, добрым сынам!

*Ніна Галіноўская*

?!

**1.** Чаму мама рана ўстае і позна кладзецца?
**2.** Што трэба рабіць, каб мама часцей смяялася?
**3.** Як ты разумееш словы *будзь верным, добрым сынам*?


Правообладатель Народная асвета

**4.** Якія ласкавыя словы можна сказаць маці?
**5.** Як і чым ты дапамагаеш сваёй маці? Раскажы.

## Якая ў мяне мама

Прачытай словы ў кожнай кветцы, ідучы ад меншай лічбы да большай.




**Чытай правільна:** ве́т-лі-выя, да-ра-жы́ць.

## Ветлівыя словы

Калі ласка, дзякуй, добры дзень —
ветлівыя словы
чую ад людзей.
Ветлівымі словамі
трэба даражыць.
З ветлівымі словамі
лёгка жыць.

*Таццяна Кляшторная*

Правообладатель Народная асвета

**1.** Калі ты гаворыш словы *калі ласка, дзякуй, добры дзень, добрай ночы, прабачце*?
**2.** Чаму з ветлівымі словамі лёгка жыць?
**3.** Прыдумай апавяданне па плане, ужываючы *чарадзейныя* словы *калі ласка* і *дзякуй.*



1) Алесь рашае задачу.
2) Задача не атрымліваецца.
3) Алесь паклікаў бацьку. Як?
4) Бацька дапамагае хлопчыку.
5) Хто каму скажа *дзякуй*?

## Падумай — адкажы

Чым адрозніваюцца словы: *салю́ — со́ллю*? Навучыся іх чытаць і растлумач іх.

**Чытай правільна:** па-кла-ні́-ся лю́-дзям, за-пра-ша́-ем.

## Пакланіся добрым людзям

Век дзяліся тым, што маеш,
Хлебам-соллю, казкай-краскай.
Ну а ў госці запрашаеш,
гавары ўсім:
— Калі ласка. *Уладзімір Паўлаў*

**1.** Як ты разумееш выразы *хлебам-соллю, казкай-краскай*?
**2.** Якія добрыя парады дае аўтар?


Правообладатель Народная асвета

## Добра ўсім

Накарміла бабка дзеда
і ўнучку.
Накарміла Юля Мурыка
і Жучку.
А скажыце, бабцы
хто падасць абед?
Юлечка-ўнучка.
Ёй паможа дзед.

*Ніна Галіноўская*





?!
**1.** Хто такія Мурык і Жучка?
**2.** Чаму верш называецца «Добра ўсім»? Знайдзі адказ у тэксце.
**3.** Якія яшчэ малюнкі можна зрабіць да верша?

Правообладатель Народная асвета

**4.** Колькі сказаў у вершы? Як гэта вызначыць? Прачытай кожны сказ.
**5.** Якія словы ў сярэдзіне сказа пішуцца з вялікай літары? Чаму?
**6.** Ці ёсць у цябе дома кот або сабака? Раскажы пра яго па плане.

1) Якая ў яго мянушка?
2) Дзе ён жыве?
3) Хто яго корміць?
4) Што ён любіць?
5) Як ты з ім гуляеш?

**Чытай правільна:** на-ра-дзі́-лі-ся, ма-ле́нь-кія ка-ця-ня́-ты, ады-сці́, ад-но́й-чы, вяр-ну́-ла-ся, да-лі-чы́ла-ся.

## Мурка

У кошкі Муркі нарадзіліся тры маленькія кацяняты. Мурка карміла іх сваім малачком. Вочкі ў кацянят яшчэ не бачылі, і малыя баяліся адысці ад маці. Але аднойчы Мурка выйшла пагуляць, а калі вярнулася, не далічылася аднаго кацяняці...

?!

**1.** Каго нарадзіла Мурка?
**2.** Чым Мурка карміла кацянят?
**3.** Чаму кацяняты не адыходзілі ад маці?
**4.** Што здарылася аднойчы? Прыдумай працяг апавядання.


Правообладатель Народная асвета

Складзі апавяданне «Мой коцік».

**Выкарыстай словы:** *мама, тата, я, папрасіў, коцік, купіў, вочкі зялёныя, лапкі мяккія, хвост пушысты, радаваўся, малако, кармлю сам.*

## Падзелімся думкамі

Ці добра быць здаровым? Чаму?
Ці трэба дапамагаць дарослым? Чаму?
Ці трэба паважаць працу дарослых? Чаму?
Ці любіш ты сваіх родных? Як?
Ці любяць цябе родныя, сябры? Як?

**Чытай правільна:** ады-хо́-дзя-чы, вяр-ну́-ла-ся, пад-ме́-це-на, ста-рэ́й-шую.

## Не хапіла работы

Адыходзячы на работу, маці паклікала Лізу і Таню і сказала:

— Прыбярыце са стала, памыйце талеркі і лыжкі, падмяціце чысценька падлогу на кухні.

— Добра, мамачка. Усё зробім, — дружна адказалі дочкі.

Вярнулася маці дадому і бачыць: стол заслany чыстым абрусам, талеркі і лыжкі вымыты. А кухня чыста-чыста падмецена. І смецце вынесена.

— Малайцы, дзеткі, добра зрабілі, — пахваліла маці дзяўчынак.

Правообладатель Народная асвета

— Каторая з вас са стала прыбрала?

— Я, — голасна сказала Таня.

— А хто талеркі і лыжкі памыў і паставіў на месца?

— Я, — зноў адказала Таня.

— Ну, а ты, Ліза, што рабіла? — глянула маці на старэйшую дачку.

— Я... я нічога, мама, не рабіла... Таня ўсё зрабіла сама. Мне не хапіла работы, — ціха адказала дзяўчынка і вінавата апусціла галаву.

*Мікалай Парукаў*

1. Знайдзі ў тэксце і прачытай, што мама прасіла зрабіць.
2. Што яна ўбачыла, калі вярнулася дадому? Раскажы.
3. Хто табе больш спадабаўся: Таня або Ліза? Чаму?
4. Чаму апавяданне называецца «Не хапіла работы»?
5. Прыдумай сваю назву да апавядання.

## Рукі

Сам зрабіў я табурэт.  
— Малайчына, — хваліць дзед.  
Гэта ж рукі ўсё зрабілі,  
хай бы іх і пахвалілі.

*Ніна Галіноўская*


Правообладатель Народная асвета

**1.** Якое слова можна прачытаць, калі ўставіць літары?

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| м | | л | | й | | ы | | а |

Знайдзі яго ў вершы.

**2.** Чаму дзед хваліць унука?

**3.** Якімі яшчэ словамі можна пахваліць унука?

**Чытай правільна:** за-сма́-жы-ла, са-ра-ка-но́ж-ка.

## Чаго крычыце?

У нядзелю ўсе дома. Паселі абедаць. Бацька, дзеці — усе наўкол стала. А маці гаворыць, што засмажыла курыцу з салодкай морквай. Чуваць прыемны пах.

— Мне ножку! — заказвае Юля.

— І мне ножку! — крычыць Галя.

— І мне. Мне мама заўсёды дае ножку! — крычыць Толя.

Дзяніс, самы малодшы за ўсіх, сядзіць спакойна і разважае:

— Ну чаго ж вы крычыце? Хіба ж курыца сараканожка?

*Іван Грамовіч*

**1.** Як ты думаеш, якое гэта апавяданне: *сумнае, вясёлае* ці *смешнае*? Чаму?

Правообладатель Народная асвета

**2.** Перакажы твор. Пастарайся перадаць настрой кожнага з дзяцей: нецярплівасць Юлі, Галі і Толі, разважлівасць Дзяніса.

**3.** Размяркуйце ролі. Вызначце, хто будзе Юля, Галя, Толя і Дзяніс. Знайдзіце словы кожнага героя. Прачытайце апавяданне па ролях.

## Мая мама самая прыгожая

У Савы было Савяня. Вялікае, з вялікімі вачыма і вялікім ротам.

Совы лятаюць толькі ноччу. Яны баяцца яркага сонца.





Правообладатель Народная асвета

Сава вучыла свайго сына:

— Не вылятай удзень з дупла. Асляпіць цябе сонца — не знойдзеш дарогі дадому.

Савяня было непаслухмянае. Яно вылезла з гнязда, зажмурыла вочы і паляцела на луг. Там яно расплюшчыла вочы і аслепла. Сядзіць у траве і плача.

Падыходзіць да яго Чапля.

— Ты чыё? — пытае.

— Я Савяня. Мая мама Сава. Я нічога не бачу. Адвядзіце мяне хутчэй да мамы.

— Якая ж у цябе мама?

— Мая мама самая прыгожая ў свеце. У яе такія добрыя і ласкавыя вочы. Ні ў каго няма такіх вачэй, толькі ў маёй мамы.

*Васіль Сухамлінскі*

**1.** Што здарылася з Савянём? Чаму? Раскажы.
**2.** Разгледзь малюнак. Знайдзі ў тэксце радкі, якія адпавядаюць малюнку.
**3.** Прачытайце па ролях словы Чаплі і Савяняці.
**4.** Чаму Савяня лічыла, што яго мама самая прыгожая?
**5.** Перакажы казку блізка да тэксту.

**Выкарыстай словы:** *Сава, Савяня, ноч, баяцца, сонца, вочы, аслепла, Чапля, мама, самая прыгожая.*

Правообладатель Народная асвета

## Загадка

Удзень спіць, а ўночы крычыць.

Знайдзі адгадку (*зязюля, сава, верабей*).

**Чытай правільна:** ня́нь-чы-лі, ла́-шчы-лі, сар-дэ́ч-ныя, шча-слі́-выя, цяр-плі́-выя.

## Маміны рукі

Маміны рукі самыя лепшыя:
няньчылі, гушкалі, лашчылі першыя.

Маміны рукі сардэчныя, смелыя,
маміны рукі самыя ўмелыя.

Маміны рукі — рукі шчаслівыя,
маміны рукі заўсёды цярплівыя.

Маміны рукі самыя светлыя,
маміны рукі самыя ветлыя.

*Пятрусь Прануза*

В é т л ы я — ласкавыя.

**1.** Якімі словамі апісвае паэт рукі маці?
**2.** Як ты разумееш словы *рукі сардэчныя, смелыя; рукі шчаслівыя, цярплівыя, ветлыя?*
**3.** Раскажы пра сваю маці па плане.


Правообладатель Народная асвета

1) Як завуць тваю маму?
2) Якога колеру ў яе вочы?

**4.** Калі ў тваёй маці вочы свецяцца радасцю?
**5.** Як яна цябе лашчыць?
**6.** Як ты выказваеш сваю любоў да яе?

## Прымаўкі

Птушка рада вясне, а дзіця маці.
Матчыны рукі заўсёды мяккія.
Пры сонейку цёпла, а пры маці добра.

?!
**1.** Растлумач прымаўкі.
**2.** Якая з прымавак падыдзе да верша «Маміны рукі»?
**3.** Вывучы адну прымаўку на памяць.

## Я чакаю маму

Я чакаю маму
вечарам з работы.
Вывучыла ўрокі,
вычысціла боты.

А сястры Наташы
казку прачытала,
накарміла кашай,
каб спакойней спала.

Правообладатель Народная асвета

Толькі мама прыйдзе
і расчыніць дзверы,
я кажу: «Гатова
для цябе вячэра».

*Пятрусь Пранузa*

**1.** Што можна сказаць пра дзяўчынку? Якая яна?
**2.** Што зрабіла дзяўчынка, пакуль дома не было маці? Прачытай.
**3.** Прадоўжы сказ: *Мая мама (якая?) ... .*
**4.** Знайдзі ў тэксце рыфмаваныя словы: *работы — боты, Наташы — ..., дзверы — ... .*
**5.** Вывучы верш на памяць.

## Шчаслівая мама

Пяць дачок у маці,
родных пяць галубак.
Што ні робяць дочкі —
глянуць воку люба!

Галя мые кухню,
залу — Лена з Верай.
А Хрысціна смажыць
бульбу на вячэру.

Меншая, Анюта,
хлеб купіла ў краме...
Залатыя дочкі
у шчаслівай мамы!

*Міхась Хамянкоў*


Правообладатель Народная асвета

?!

1. Колькі ў маці дачок?
2. Што яны робяць? Прачытай.
3. Чаму паэт называе дачок *залатымі*?
4. Як можна назваць дзяўчынак другімі словамі?
5. Чаму іх мама шчаслівая?

**Чытай правільна:** пры-бра́ў-шы, на-скрэ́б-ла.

## Самы лепшы малюнак

Маці падмятала падлогу, а Пеця сядзеў за сталом і маляваў.

— Мама, я цябе намалюю, — сказаў ён.

— Намалюй.

І Пеця намаляваў маці з венікам у руках.



Правообладатель Народная асвета

Потым маці чысціла пыласосам дываны. А Пеця таксама яе маляваў.

Прыбраўшы ў кватэры, маці памыла на кухні посуд, наскрэбла бульбы. Пеця намаляваў яе і за гэтай працай.

Усе малюнкі хлопчык рабіў каляровымі алоўкамі. Прыгожая атрымалася маці.

Прыйшоў бацька з работы. Пеця пахваліўся:

— Тата, зірні, якую я маму намаляваў. Вось яна падлогу падмятае, а вось — з пыласосам. А тут талеркі мые. Праўда, я добра намаляваў?

— Добра, — згадзіўся бацька.

— А які самы лепшы малюнак?

— Той, што ты не намаляваў.

— Які ж гэта?

— Дзе ты памагаеш маме прыбіраць кватэру, мыць посуд, скрэбці бульбу. А не толькі малюеш.

*Васіль Хомчанка*

**1.** Раскажы, што рабіла мама. Выкарыстай малюнак.

**2.** Чым займаўся Пеця? Прачытай.

**3.** Што намаляваў Пеця?

**4.** Прачытай, што сказаў тата, калі ўбачыў малюнкі сына.

**5.** Які малюнак хацеў убачыць бацька? Прачытай.

**6.** Прыдумай сваю назву да гэтага апавядання.


Правообладатель Народная асвета

**Чытай правільна:** без-ба-ро́-ды, на-ма-ля-ва́ць.

## Безбароды дзед
(*Жарт*)

Любіць Слава маляваць,
ад стала не адарваць.
Падышоў да Славы дзед:
— Я заказваю партрэт.
Намалюй, унук, мяне.
— Не змагу, дзядуля, не:
ты не маеш барады
і для дзеда малады.
Пастарэй гадоў на пяць —
я змагу намаляваць.

*Ніна Галіноўская*

**1.** Які гэта верш: *вясёлы, смешны* ці *сумны*?
**2.** Знайдзі ў вершы радкі, якія трэба чытаць ад імя дзеда, ад імя Славы і ад аўтара.
**3.** Размяркуйце ролі і прачытайце верш па ролях.

## Урок

З самай раніцы
Змітрок
вучыць з мамаю
урок.

Правообладатель Народная асвета

Дзед смяецца:
— Унук, відаць,
атрымае «дзевяць».
Кажа бабка:
— Гэта так.
Ды не ўцямлю я ніяк:
прынясе адзнаку ўнук,
як яе дзяліць
на двух?

*Міхась Хамянкоў*

Не ўця́млю — не зразумею.

**1.** Чаму бабуля лічыць, што адзнаку трэба дзяліць на двух?

**2.** Ці можна гэты верш аднесці да жарту? Чаму?

**3.** Задай свае пытанні да верша.

**Чытай правільна:** ва-ла-сі́н-кі, ус-міх-ну́-ла-ся, вы-со́з-нае.

## Сівая валасінка

Міхась убачыў у матчынай касе тры сівыя валасінкі.

— Мама, у вас у касе тры сівыя валасінкі, — сказаў ён.

Мама ўсміхнулася і нічога не адказала.


Правообладатель Народная асвета

Праз колькі дзён Міхась глянуў на матчыну касу і ўбачыў у ёй чатыры сівыя валасінкі.

— Мама, — сказаў Міхась, — у вас у касе чатыры сівыя валасінкі… А было ж толькі тры. Чаму ж пасівела яшчэ адна?

— Ад болю, — адказала маці. — Калі баліць матчына сэрца, тады і валасінка сівее.

— А ад чаго ж у вас сэрца балела?

— Памятаеш, ты палез на высознае дрэва… Я зірнула ў акно, убачыла цябе на тоненькай галінцы. Сэрца забалела, і валасінка пасівела…

Міхась доўга сядзеў задумлівы, маўклівы. Потым ён падышоў да маці, абняў яе і паціху спытаўся:

— Мама, а калі я на тоўстай галіне буду сядзець, — валасінка не пасівее?

*Васіль Сухамлінскі*

**1.** Што ўбачыў Міхась? Раскажы.

**2.** Чаму ў мамы з’явілася яшчэ адна сівая валасінка? Прачытай.

**3.** Як мама растлумачыла Міхаську, чаму ў яе з’явілася сівая валасінка?

**4.** Ці зразумеў хлопчык маму?

**5.** Што трэба рабіць, каб не сівелі валасы ў тваёй мамы?

Правообладатель Народная асвета

## Прачытай размову і знайдзі ў ёй прыказку

— Тата, давай пагуляем з табою ў шашкі.

— Я, сынку, заняты. Трэба кончыць працу.

— А мне сумна.

— Знайдзі сабе занятак. Памый свае шкарпэткі, насоўкі. Хто працуе, той не сумуе.

## Прыказка

Старога паважай, малога павучай.

## Босыя цукеркі

Здалёк
прыехала бабуля,
па Мінску пахадзіла.
Яна для ўнучкі-капрызулі
«падушачак» купіла.
А ўнучка
пазірае скоса:
— Я не хачу
цукерак босых!

*Рыгор Барадулін*

?! **1.** Як ты разумееш слова *капрызуля*?
**2.** Як ты разумееш словы «босыя цукеркі»?
**3.** Паспрабуй прачытаць словы ўнучкі сярдзіта, незадаволена.


Правообладатель Народная асвета

## Падлічы

— Дзве цукеркі,
потым тры
дам табе я, Галя.
Колькі будзе?
Падлічы.
— Мне іх не давалі.

*Пятрусь Пранузa*

Ці можна гэты верш назваць жартам? Чаму?

**Чытай правільна:** ня-пра́-віль-на.

## Што трапіла сюды выпадкова?



## Знайдзі прыказку

— Бабулечка, кідай працаваць, пойдзем хутчэй у лес па грыбы.

— Спяшыць — людзей смяшыць. Паспеем яшчэ і грыбоў назбіраць.

Правообладатель Народная асвета



## Яблык

Дзед быў на рынку і купіў сабе яблык. Вялікі, з залацістымі бакамі і празрысты. Нават зярняткі відаць.

Пакруціў дзед у руцэ яблык, хацеў з'есці, ды перадумаў.




Правообладатель Народная асвета

— Занясу дадому. Дзяцей пачастую.

Дома аддаў яблык унучцы Ніне.

— Ой, які яблык вялікі!— усміхнулася Ніна. І толькі яна хацела адкусіць, як прыйшла з работы маці.

— Мамачка,— сказала Ніна,— ты стамілася. Вазьмі з'еш яблык.

Маці падзякавала Ніне, узяла яблык, палюбавалася ім.

— Я Міхаську пачастую. Ён жа ў нас самы маленькі, — сказала маці. І калі Міхаська вярнуўся з дзіцячага сада, аддала яблык яму.

Міхаська нават ножкамі затупаў ад радасці, такі яблык яму далі — вялікі, залацісты. Прыгожы!

Міхаська раздзяліў яблык на чатыры часткі і сказаў:

— Гэта, дзядуля, табе, гэта маме, а гэта мне і Ніне, — падзяліў ён. — Ешце, калі ласка.

Смачны быў яблык. Салодкі, сакавіты. Усе елі і хвалілі Міхаську. А больш за ўсіх хваліў дзядуля.

*Васіль Хомчанка*

?!

**1.** Які яблык купіў сабе дзед? Прачытай.
**2.** Чаму ён сам не з'еў яблык?
**3.** Як яблык дастаўся Міхаську?
**4.** Што зрабіў Міхаська? Раскажы.
**5.** Чаму дзядуля больш за ўсіх хваліў хлопчыка?
**6.** Прыдумай сваю назву апавядання.
**7.** Перакажы тэкст з дапамогай малюнкаў.

Правообладатель Народная асвета

**Чытай правільна:** ма-ле́нь-кія, пы-та́-лі-ся, дзе́-вяць, дзе-ся́-тую, да-ча-ка́-еш-ся.

## Дзядуля і яблынькі

Садзіў дзядуля
маленькія яблынькі.
Пыталіся дзеці:
— Ці скора яблыкі?
— Чакайце, дзеткі,
дзевяць вёсен,
дзевяць летаў,
дзесятую восень.
— А сам, дзядуля,
ці дачакаешся?
— Не, не дачакаюся,
дачакаюцца іншыя.
Дачакаюцца іншыя,
дзякуй скажуць.

*Ян Райніс*

?!

**1.** Што рабіў дзядуля? Адкажы словамі верша.
**2.** Пра што спыталіся ў дзядулі дзеці?
**3.** Прачытай адказ дзядулі дзецям.
**4.** Ці спадабаўся табе дзядуля? Чым?
**5.** За што дзядулю скажуць *дзякуй*?
**6.** Знайдзі ў вершы словы, у якіх ёсць ***дз***. Навучыся правільна чытаць гэтыя словы.


Правообладатель Народная асвета

## Якая літара згубілася?

Ябл_кі, дзя_уля, во_ень.

Знайдзі гэтыя словы ў вершы.

## Прыказкі

Дзе няма ахвоты, там няма работы.
Садок садзіць — жыццё харашыць.
Хочаш добра жыць — павінен працу любіць.

?!
**1.** Растлумач прыказкі.
**2.** Якая прыказка падыходзіць да верша «Дзядуля і яблынькі»?

**Чытай правільна:** вяр-та́-ец-ца, пры-сма́-ка-мі, пры-ві-та́н-не.

## Пра Дашу

Часта Дашына бабуля ходзіць да сваёй старэйшай дачкі. А як вяртаецца дадому, заўсёды мае ў сумцы пакуначак з цукеркамі ці яшчэ з якімі прысмакамі — для Дашы.

Дзеду бабуля кажа:

— Прывітанне табе ад старэйшых унукаў.

— А мне? — пытае Даша.

— І табе прывітанне ад Зойкі і Марынкі.

— То давай яго хутчэй! — патрабуе Даша.

*Павел Кавалёў*

Ці стала табе смешна? Чаму?

Правообладатель Народная асвета

Знайдзі гэтыя словы ў тэксце «Пра Дашу».

дзе_у Да_а
су_цы п_тае
хут_эй

## Рабінка

Быў цёплы вясновы дзень. Неба звінела ад жаваранкаў.

Бацька і Алёнка пайшлі ў лес, каб выкапаць дрэўца і пасадзіць яго перад хатаю. Яны спыніліся каля бярозкі.

— Выкапаем гэтае дрэўца, — сказала Алёнка.

— Не, дачушка, — прамовіў бацька. — Яно яшчэ маленькае, хай падрасце...

Яны пайшлі далей.

Каля дарогі, на ўзгорку, рос дубок.



— Вось гэты дубок наш, — узрадавана загаварыў бацька. — З яго вырасце вялікае дрэва. Яно будзе ўзвышацца над хатаю і весела гаманіць з вятрамі...

Але раптам дзяўчынка ўбачыла прыгожую рабінку.

— Татка, выкапаем гэтую рабінку! Вясною яна будзе пахнуць кветкамі. Увосень да яе прыляцяць


Правообладатель Народная асвета

птушкі і будуць ласавацца ягадкамі. А мне тады не будзе сумна адной у хаце...

І бацька выкапаў рабінку. *Анатоль Раманенка*

**1.** Навошта бацька з Алёнкай пайшлі ў лес?
**2.** Чаму бацька не захацеў выкапаць бярозку? Раскажы.
**3.** Чым спадабаўся бацьку дубок?
**4.** Як ты разумееш сказы: *неба звінела ад жаваранкаў, дубок будзе гаварыць з ветрыкам?*
**5.** Якое дрэва падабаецца табе? Чаму? Апішы яго словамі.

## Якія словы можна скласці?

со [ ]    с [ ] м    с [ ] н

[м] [х] [н]    [а] [о]    [о] [ы]

## Гульня «Што можна рабіць з прадметам?»

Раздзяліцеся на дзве-тры каманды. Выйграе каманда, якая прыдумае больш адказаў.

— Што можна рабіць з кнігай? (Чытаць, узяць у рукі і г. д.)

— Што можна рабіць з алоўкам? (Пісаць, маляваць і г. д.)

— Што можна рабіць з ручніком? (Выцірацца, мыць і г. д.)

Правообладатель Народная асвета

## Дружная сям’я

?!

**1.** Разгледзь малюнкі.
**2.** Раскажы, што робяць маці, бацька і іх дзеці.
**3.** Дай дзецям імёны.
**4.** Складзі па малюнках апавяданне.
**Выкарыстай выразы і словы:** *мые падлогу, выцірае пыл, пыласосіць, папрацавалі разам.*
**5.** Перачытай прыказкі на старонцы 95. Падумай, якая прыказка падыходзіць да малюнкаў.









Правообладатель Народная асвета

## ЗМЕСТ

Незаменнае. *Васіль Жуковіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

## З ВУСНАЎ У ВУСНЫ

Калыханкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
Забаўлянкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Родзічы. *Віталь Гардзей* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
Коця і Каця. *Васіль Вітка* . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Будзь уважнай. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . 9
Коцік прачынаецца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Малы ласун . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Што надзенеш? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Беларускія народныя песні . . . . . . . . . . . . . . . . 13
Па бары хаджу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Бяроза з лістком . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Асвяці і абагрэй . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Прыказкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Лічылкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Загадкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
Як зваць дзяцей? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Падумай — адкажы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Загадка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Што за ягады? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Падбяры словы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Смяшынкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Параўнай словы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Валёнкі стаміліся . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —

Правообладатель Народная асвета

У цёмных акулярах. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . . . 24
Ты пачаў, Ясь, лепш вучыцца. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
Небыліцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Аладка. *Уладзімір Паўлаў* . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Вартаўнік. *Уладзімір Паўлаў* . . . . . . . . . . . . . . . —
Я за рэхам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
Апанас. *Уладзімір Паўлаў* . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Аловак. *Міхась Казакоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Загадка. *Ляжыць паленца* . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Скорагаворкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

## АСЕННЯЯ СТАРОНКА

Поры года. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . . . . . . . . . . . 32
Загадка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Хлебная скарынка. *Авяр'ян Дзеружынскі* . . . . . . . —
Скорагаворка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Верасень. *Клаўдзія Каліна* . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Лістапад. *Генадзь Шмань* . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Прымаўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Хачу ўсё ведаць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Хітры падасінавік. *Змітрок Бяспалы* . . . . . . . . . . —
Ці ведаеш ты грыбы? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Цёплы грыб. *Васіль Хомчанка* . . . . . . . . . . . . . . 38
Загадка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Павучок. *Мікола Бусько* . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Казкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Вавёрка і Заяц . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42


Правообладатель Народная асвета

Лісіца і сабакі. (*Руская народная казка*) . . . . . . . . 44
Коцік Петрык і мышка. (*Беларуская народная казка*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Чаму кот толькі пасля снедання мыецца. (Літоўская народная казка) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Сарока-манюка. *Алесь Зэкаў* . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Каго як завуць? *Анатоль Клышка*. . . . . . . . . . . . . . 49
Пазнай герояў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Віні-Пух у доктара. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . . . . 52
Дзед і два мядзведзі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
З якой мы казкі? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Прыказкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 55
Былі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Бацька і сыны. *Леў Талстой* . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Такіх кветак не бывае. *Вісарыён Гарбук* . . . . . . . . 56
Два таварышы. *Леў Талстой* . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Прыказкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Кампот. *Клаўдзія Каліна* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
Складзі словы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Дзіркі новыя. *Мікола Янчанка* . . . . . . . . . . . . . . . . —
Старанны і гультай . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61
Складзі прыказкі са слоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Гульня «І я разам». . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62

## Я І МАЯ СЯМ'Я

Прыказка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
Твой род, твая Радзіма. *Васіль Вітка* . . . . . . . . . . —
Сямейны хор. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . . . 64

Правообладатель Народная асвета

Мая сястра. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Прыказкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Мікола і Маша. *Галіна Каржанеўская* . . . . . . . . . . . . 67
Прыказка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Мае падарункі. *Сцяпан Кацуба* . . . . . . . . . . . . . . . —
Абібок. *Мікола Хамянкоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Загадка. *Валянціна Коўтун* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Радасць. *Мікола Рудзішкін* . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Браты. *Пятрусь Прануза* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70
Падзяка. *Павел Кавалёў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Складзі прымаўкі з дапамогай пытанняў . . . . . . . . 72
Слова пра маці. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . —
Якая ў мяне мама . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Ветлівыя словы. *Таццяна Кляшторная* . . . . . . . . . . —
Пакланіся добрым людзям. *Уладзімір Паўлаў* . . . . 74
Добра ўсім. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Мурка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Складзі апавяданне «Мой коцік» . . . . . . . . . . . . . . . 77
Падзелімся думкамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Не хапіла работы. *Мікалай Парукаў* . . . . . . . . . . . —
Рукі. *Ніна Галіноўская* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Чаго крычыце? *Іван Грамовіч* . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Мая мама самая прыгожая. *Васіль Сухамлінскі* . . 80
Загадка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Маміны рукі. *Пятрусь Прануза* . . . . . . . . . . . . . . . . —
Прымаўкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
Я чакаю маму. *Пятрусь Прануза* . . . . . . . . . . . . . . . —
Шчаслівая мама. *Міхась Хамянкоў* . . . . . . . . . . . . . 84


Правообладатель Народная асвета

Самы лепшы малюнак. *Васіль Хомчанка* . . . . . . . 85
Безбароды дзед (Жарт). *Ніна Галіноўская*. . . . . . . 87
Урок. *Міхась Хамянкоў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Сівая валасінка. *Васіль Сухамлінскі* . . . . . . . . . . . 88
Прачытай размову і знайдзі ў ёй прыказку . . . . . 90
Прыказка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Босыя цукеркі. *Рыгор Барадулін* . . . . . . . . . . . . . . —
Падлічы. *Пятрусь Пранузa* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
Што трапіла сюды выпадкова? . . . . . . . . . . . . . . . . —
Знайдзі прыказку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Яблык. *Васіль Хомчанка* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Дзядуля і яблынькі. *Ян Райніс* . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Якая літара згубілася? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
Прыказкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Пра Дашу. *Павел Кавалёў* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . —
Рабінка. *Анатоль Раманенка* . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
Якія словы можна скласці? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Гульня «Што можна рабіць з прадметам»?. . . . . . —
Дружная сям’я. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98

Правообладатель Народная асвета

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Варапаева** Валянціна Сцяпанаўна
**Куцанава** Таццяна Сцяпанаўна

**Літаратурнае чытанне**

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 1

2-е выданне, дапоўненае

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *Л. М. Ясніцкая*. Мастацкі рэдактар *Л. А. Дашкевіч*. Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплаводская.* Камп'ютэрная вёрстка *А. Ю. Гурчонак.* Карэктары *Д. Р. Лосік, В. С. Бабеня, Т. М. Вядзернікава.*

Падпісана ў друк 12.02.2010. Фармат $70 \times 90^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура журнальная рубленая. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 7,61. Ул.-выд. арк. 4. Тыраж 1048 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку». ЛП № 02330/049156 ад 03.04.2009. Вул. Каржанеўскага 20, 220024, Мінск.

Правообладатель Народная асвета